# Рукапісы і кнігі XVI і XVII стагоддзяў

Беларуская дзяржаўная бібліятэка імені Леніна адправіла ў Маскву на выстаўку вызяўленчага мастацтва БССР з сваіх фондаў 50 каштоўных старажытных рукапісаў і друкаваных твораў, якія ў асноўным адносяцца да XVI і XVII стагоддзяў. Кнігі друкаваліся ў Магілёве, Віцебску, Гродне, Бабруйску і іншых гарадах Беларусі.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць рукапісы «Вопросы князя Антиоха и ответы Афанасия»— беларускі палууст, «Служба, житие и чудеса Зусима и Совагия», «Евангелие учительное», «Перло драгоценное» і інш.